*Любоў Сіўрава*

## ПАСТУХОЎСКІЯ ГУЛЬНІ ЯК СРОДАК САЦЫЯЛІЗАЦЫІ БЕЛАРУСАЎ

У беларускіх сялян у канцы XIX — сярэдзіне XX стагоддзяў існавала завядзёнка працы дзяцей 6—13-гадовага ўзросту ў якасці пастухоў авечых і каровіных статкаў. Гэты грамадскі звычай апісаў беларускі этнограф П. В. Шэйн: “Як толькі міне дзіцяці 7 гадоў, то будзь то дзяўчынка ці хлопчык, яго пасылаюць у поле са скацінай. Пастухом дзіця бывае да 13, пасля гэтага тэрміну бацька — сына, а маці — дачку пачынаюць прывучаць да працы, г. зн. браць з сабою ўсюды” (Віцебскі павет) [7, с. 10]. “З 6 гадоў хлапец становіцца пастушком і шпацыруе па палёх у зрэбных штанах, старой світцы, шапцы, з торбачкай” (Бабруйская акруга) [3, с. 35].

Пастухоўства сярод дзяцей было звычайнай з’явай сялянскага жыцця на ўсёй тэрыторыі Беларусі. “З малога ўзросту дзеці пачыналі дапамагаць бацькам. Яны пасвілі гусей, свіней, коз, авечак, коней, кароў. Хлопчыкам падабалася гэтая праца, нягледзячы на тое, што яна была не такой ужо і лёгкай і вельмі адказнай. Па-першае, выганяць жывёлу ў поле патрэбна ў любое надвор’е: летам — у спёку і праліўныя дажджы, вясною і ўвосень — у золь і непагоду. Па-другое, трэба было сачыць, каб жывёла не пашкодзіла людскія і калгасныя палеткі: за шкоду пастушкі неслі адказнасць. Але дзеці ўсё роўна любілі гэтую працу. З асаблівай ахвотай пасвілі коней і кароў, бо тыя часта адпачывалі. У гэты час у дзяцей была магчымасць заняцца разнастайнымі цікавымі справамі. Яны плялі кошыкі, лапці, дзяўчаты звівалі вянкі, збіралі ягады, лекавыя травы. Калі статак пасвілі ля ракі, з задавальненнем купаліся, лавілі рыбу” [7, с. 167–168].

Абставіны вясковага жыцця даводзілася ўлічваць у школьнай праграме. Па той прычыне, што многія дзеці былі заняты пастухоўскай працай, у вясковых школах навучальны год пачынаўся позна. Усе вучні збіраліся, калі выпадаў снег, спыняўся выпас жывёлы, і статкі станавіліся на зімоўку. Для такіх хлапчукоў і дзяўчынак заняткі заканчваліся ранняй вясной, таму што бацькі вымушаны былі адрываць сваіх дзяцей ад школы і пасылаць іх пасвіць жывёл [1, л. 21].

З маленства дзеці дапамагалі пасвіць членам сваёй сям’і альбо наёмным пастухам у якасці падпаскаў. Паступова яныпераймалі прафесійныя веды і навыкіад больш сталых і вопытных пастухоў, засвойвалі прыёмы пасьбы, вывучалі спосабы абароны статка ад ляснога звера. З цягам часу ім даручалі статкі аднаго альбо некалькіх двароў, цэлага хутара, вуліцы альбо ўсёй вёскі.У “пастухоўскайшколе” дзецінабываліведы і навыкі догляду за жывёлай, неабходныя ў самастойным вядзеннігаспадаркі. Праца пастухаміфарміравалапрацавітасць, добрасумленнасць і іншыя станоўчыя чалавечыя якасці.У народзе казалі: *“Хто добры пастух, той і гаспадар добры”* ды павучалі: *“Вучыся гаспадарыць, яшчэ тавар (жывёл) пасучы”* [4, с. 144].

Пасьба свойскай жывёлы была прасторай для калектыўнай творчасці і міжасобасных зносін. Дзеці бавілі час у разнастайных занятках — майстравалі, спявалі, распавядалі казкі, былічкі,забаўляліся, дзяліліся ўражаннямі[6, с. 99–105].Асабліва важнае значэнне ў сацыялізацыі дзяцей мелі пастухоўскія гульні. “Свой час яны праводзяць, як ім падабаецца, забаўляюцца ў розныя гульні: у коні, у цурбалку, у клясы, у нырца, ваякі. Некаторыя гульні (у стрэльбу) часткова маюць уплыў вайны. Дзяўчаты ладзяць карагоды, гуляюць у ката і мышку” [2, с. 35].У гульняхмадэляваліся розныя жыццёвыя сітуацыі, канцэнтраваўсягаспадарчы вопыт, выпрацоўваліся ўменні і навыкі, неабходныя ў самастойнай жывёлагадоўчай дзейнасці.

Этнограф Е.Р. Раманаў у “Беларускім зборніку” (1912 г.) занатаваў пастухоўскую гульню “У казу”: “В козу играют во время пасьбы лошадей – “коло коней”. Играющие выбирают пастуха. Для этого они расставляют широко ноги и согнувшись бросают через отверстие между ногами шапки назад от себя. Чья шапка упала ближе других, тот и должен пасти коз. Вбивают в землю колышек, привязывают к нему оброть с поводом и дают пастуху конец повода. Пастух держится за конец повода. Потом играющие складывают у колышка свои шапки, которые называются козами.Пастух берёт в руки хворостину или кнут и пасёт коз, т.е. старается не допустить играющих подбежать к колышку и схватить свою шапку так, чтобы пастух не ударил их кнутом. Если будет схвачено три козы (шапки), то его гонят сквозь строй. Для этого играющие опять широко расставляют ноги и провинившийся пастух должен на четвереньках бежать между ними. При этом его бьют шапками” [5, с. 568–569]. Як бачна, гульня “У казу” імітавала сітуацыі, калі пастух выступаўу ролі ахоўніка статка ад лясных драпежнікаў. Калі “пастух” не мог супрацьстаяць “лясным злачынцам” іў яго не атрымлівалася захаваць цэласнасць “статка”, то ён быўсурова пакараны“грамадой”.

Камандная гульня “Пастушкі”патрабавалаўвагі і спрыту. “На ўслончыках, на разасланай хусцінцы ляжаць розныя прадукты і прадметы: сухарыкі хлеба, бутэлечка з малаком, гурочкі, яйкі, місачка, кубачак, лыжка. Побач стаіць пуга. Падышоўшы да стульчыка, першы ўдзельнік завязвае вузельчык, бярэ яго ў руку назад, перадае яе наступнаму ўдзельніку. Той бяжыць з пугай да вузельчыка, бярэ яго, а пугу пакідае наўслончыку. Наступны бяжыць з вузельчыкам, пакідае яго на ўслончыку, а вяртаецца з пугай назад. Апошні ўдзельнік павінен прынесці і пугу, і вузельчык, развязаць яго, паказаўшы, што ўсе рэчы на месцы. Тая каманда, якая развяжа вузельчык першай, з’яўляецца пераможцай [6].

У газеце “Наша ніва” за 6 студзеня 1911 г. апісваецца пастухоўская гульня “Авечэчка”. “Лічба ўдзельнікаўгэтай гульні не абмежавана. Выбіраецца дзьве глаўные асобы: пастух і воўк. Пастух становіцца пасярод хаты с качаргой у руках, каля яго кругом садзяцца на зямлі авечкі — хлопцы і дзяўчаты, а воўк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хаваецца за дзьвярмі. Пастух гаворыць: “Пасу, пасу авечэчкі / Ад рання да вечэра, / Воўк за гарой, а я за другой. / Я воўка не баюся: / Качарэжкай абаранюся, / Пайду да бабы і буду спаць”.

Тут пастух адыходзіць на старану і ударае сьпячаго; воўк падкрадываецца, хватае адну з авечэк і уцякае разам з ёй за дзверы. Пастух, усхапіўшыся, крычыць: “Ага ту! воўк авечку панёс!”, але воўк ужо з авечкай за дзвярмі.

Пасля гэтаго пастух ізноў выходзіць на сярэдзіну хаты і гаворыць тые самые словы: “Пасу, пасу авечэчкі” і т. д. і ідзе спаць; воўк ізноў хватае авечку і так аж пакуль не забярэ астатняй.

Тады пастух ідзе шукаць авечак і, стукаючы качаргой то на адзін бок, то на другі, гаворыць: “Воўчы сьлед, авечы сьлед, воўчы сьлед авечы сьлед”. Падходзіць да ваўка і пытае: “Ці ня відзеў панок маіх авечэк?” — “Не, ня відзеў!” — адказывае той. (Авечкі пачынаюць шумець). — “А што-ж гэта у цябе шуміць?” — “Пчолы”, — кажэ воўк. Пастух варочаецца назад і ідзе ізноў шукаць авечэк і задае воўку тые самые пытаньня. Авечкі цяпер стукаюць. Пастух пытае: “Што у цябе стукае?” Воўк кажэ: “Мае парабкі дровы сякуць”. І так далей авечкі удаюць галасы коней, курэй, гусей, аж наастатак пачынаюць блеяць. Пастух убегае ў тую каморку і прыказываючы: “Ашкіра дамоў!” уганяе іх у хату, дзе на самым пачатку гулялі.

Пасьля гэтаго пастух клічэ воўка у лазьню. Воўк пытае: “А якіе дровы?” — “Бярозавые”. — “Не хачу, надта чадзяць!” Пастух клічэ другі раз; воўк ізноў пытаецца, якіе дровы. “Асінавые”. Воўк адказываецца, што надта дымяць. Ажно за трэйцім ужо разам, калі пастух кажэ, што дровы хваёвые, воўк згаджаецца; але падыйшоўшы крыху, пытаецца яшчэ: “А сабак німа?” — “Адна ёсць сучка ліхая, і тая пад печчу здыхае, а сабака кісялём удавіўся”. Воўк ужо выходзіць на сярэдзіну хаты і, сеўшы на цыпачкі, бытцам мыецца; але пастух як крыкне: “Цюцькі, кусіце!”, дык усе тые, што былі авечкамі, кідаюцца на яго; воўк уцекае, яны даганяюць і, злавіўшы, тузаюць яго з усіх бакоў.

Пасьля ўжо падходзіць да воўка пастух і пытаецца: “А што, воўчэ, крэпка яны цябе пакусалі?”“Ой пакусалі!” — кажэ той. — “Хадзі-ж цяпер будзем мы іх кусаць” — і кідаюцца удвох на авечэк. Тые разбегаюцца ва ўсе бакі [2].

Такім чынам, у пачатку ХХ ст. дзеці беларускіхсялян з шасці-сямігадовагаўзростудалучаліся да жывёлагадоўчых заняткаў. Многія з іх займаліся пастуховай справай. Выконваючы падобную працу, дзеці аказвалі значнуюдапамогусваім сям’ям. Дзеці беднякоў, дзеці-сіроты працавалі ў якасці наёмных пастухоў.

Пастухоўскія заняткі былі сродкам першапачатковай сацыялізацыідзяцей.Стасункі з равеснікамі выпрацоўвалі ў іх калектывісцкіяякасці, фарміравалі маральна-этычныя нормы паводзін, загартоўвалі характар. Пастухоўская праца выхоўвала самастойнасць, вытрымку, адказнасць за даручаную справу. Жывёльны і раслінны свет быў крыніцай не толькі экалагічнага, але і эстэтычнага выхавання дзяцей. Прыродны лугавы і лясны ландшафт станавіўся для іх багацейшай энцыклапедыяй ведаў абнавакольным асяроддзі, развіваў у дзяцей назіральнасці іншыя станоўчыя якасці.

**Спіс літаратуры:**


1. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 6. – Воп. 13. – Адз. зах. 92.
2. НашаНіва. – 1911. – № 1, 6 студ.
3. Немцаў, А. Замоскі сельсавет Асіповіцкага раёну Бабруйскай акругі / А. Немцаў // Наш край. – 1929. – № 6–7. – С. 35.
4. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / АН БССР, Ін-т маст-ва, этнаграфіі і фальклору ; пад агульн. рэд. А. С. Фядосіка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.
5. Романов, Е. Р. Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – 600 с.
6. Сівурава, Л. П. Пастухоўства як відпрафесійныхзаняткаў / Л. П. Сівурава // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. Гуманіт. навук. – 1999. – № 3. – С. 99–105.
7. Сцепановіч, С. Роля мужчыны ў вядзенні гспадаркі ў мінулым і сёння / С. Сцепановіч // Традыцыйная культура і дзеці : праблемы этнавыхавання : матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф. (г.п. Акцябрскі, 19 –20 красав. 2006 г.) / аўт. праекта і ўклад. М. А. Козенка. – Мінск : БелДІПК, 2006. – Вып. 2. – 224 с.
8. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. — СПб. : Тип. Импер. Акад. наук, 1902. – Т. 3. – 535 с.